ГАЛЕРЭЯ

Ігар Бабкоў

# ЗАСЫНАЦЬ, ПРАЧЫНАЦЦА, СЛУХАЦЬ ГАЛАСЫ РЫБ

вершы

Мінск
І. П. Логвінаў
2008

Засынаць, пр.

УДК 881.161.3-1
ББК 84 (4Беи)-5
М 29

ГАЛЕРЭЯ Б

Калекцыя заснаваная ў 1998 г.

*Куратар калекцыі*
Ігар Бабкоў

*Дзякую*
*часопісу "Студэнцкая думка", Беларускаму Калегіюму,*
*літаратурным конкурсам, якія ладзіліся*
*Беларускім ПЭН-цэнтрам у 2004 і 2005 гг.,*
*Таварыству Villa Decius у Кракаве*
*і асабіста Андрэю Хадановічу, Валянціну Акудовічу*
*і Міколу Шакелю.*

**Вераціла, С.**
М 29 Free Вершаскладанне эпохі заняпаду : вершы / Сяргей Вераціла — Мн.: Логвінаў, 2008. — 152 с. — (Галерэя «Б»).

Першая кніга творчасьці Марыі Мартысевіч — узважаны намер аўтаркі апавесьці з дапамогай разнастайных літаратурных жанраў пра рэчы, якія яе сапраўды кранаюць. Сюжэтныя вершы і лірычная проза прадстаўляюць чытачу яе саму, яе погляды на жыцьцё, яе сьвет, яе (Беларусь) тэрыторыю, яе (1982 — XXI) "эпошку".

ISBN 978-985-6800-81-1.

УДК 881.161.3-1
ББК 84 (4Беи)-5

ISBN 978-985-6800-81-1

© Вераціла С., 2008
© Выдавец Логвінаў І. П., 2008



* * *

Вызваляючы мейсца таму, што ня мае імя
Забываючы шэпты восені, цені платана
Захлынаючыся далёкім-далёкім ветрам
Я трымаю ў пустых далонях сны акіяна

Падымаючы веі сьляпому соннаму Богу
Аплятаючы хмелем горад, даўна нямілы
Я вяртаюся ў нівеч сініх сівых пагоркаў
Над якімі плывуць нябёсаў белыя крылы

# I

## Засынаць, прачынацца, слухаць галасы рыб

* * *

Мы затанулі ў Паўночнай затоцы ў час, калі
Стырнавы нема крычаў аб блізкай зямлі

Аб стомленай поўні, схаванай пад глеем гадоў
Аб здрадлівым бляску далёкіх чужых гарадоў

Аб студнях часу, ў якіх суцішаны сны
Аб ветлых танцорках, што ткуць вялёны віны

Аб прадчуваньнях, шэптах, спакусах, аб ветры, што вее боль
Аб дрэвах на золку, якія зьядае золь

Аб веях з бурштыну, што ў келіхах сьпеляць віно
Аб садах Шыразу, што з намі пайшлі на дно...

Усё засталося: поўня, ветразь, жагляр
Толькі соль на руках і вада у твар

Біла, лашчыла, шапатала — як быццам у сьне
Твае вусны зноў шукалі мяне

* * *

Ноч прыўзьняла веі на восеньскае старонцы
Прымаючы падарункі колеру чакаляды:
Час, высмактаны да раньня, крыху віна на донцы
Заваконнага ветру зблытаныя шарады

Ноч раскінула крылы, ноч разьвінула косы
Ноч адпусьціла памяць, на вуліцы, да сьвітанку
Там, дзе празрыстых ценяў так, як ніколі, досыць
Там, дзе заплюшчыць вочы, як адгарнуць фіранку

Вецер укрые смагу, ноч заціхне ў абдымках
Сьвет паўстане далёкім, як лісты ў капэрце
Як нямое пытаньне на старых фатаздымках
Памяць аб мілых душах, што забыла памерці

* * *

За фіранкамі сноў непрытомная, пустая эпоха
Выплятае сталёвымі пальцамі ўзоры
Жалезных песень, за ёй — сіверны вецер
Б'е ў бубны, сьпявае, сіпіць немым сьвістам

Словы, цёплыя словы, хаваюцца ў траву, глебу
Порхаюць, як матылі, жывуць так мала
Што, часам здаецца — жыць неабавязкова —
дастаткова дыханьня...

Сядзець ля вакна, думаць, глядзець на аблокі
Заняцца каліграфіяй, гартаць соньнікі, паліць файку
Быць пустым, цёплым — бяз мэты — недасяжна далёкім
Аднойчы апасьці долу, з восеньскім лісьцем

* * *

Сьветлавокія барбары ня ведаюць, чым ёсьць неба
І дзеля чаго словы патрабуюць рытму
І чаму знакі даўна памерлых
Аніяк ня могуць растаць у паветры

Нібы таполевы пух, узьлятаюць у вышыню
Бяздомныя, ільнуць да сэрца, спакушаюць
Падаюць, падымаюцца, імкнуцца быць разам

Мае лісты да сябра адпраўленыя так даўна
Што сьвет тройчы перамяніўся, сны распыліў вецер
Вада застыла ў маўчаньні — і толькі аблокі
Плывуць у тую прастору, дзе ўсё застаецца



* * *

падаючы ўглыб: гэтыя руіны
праплываюць праз нас, як празь веі сон

рэчы, жужалкі, palімпсэсты —
кветкі, увязьненыя ў мінулым —
квітнеюць, зачароўваюць, спавіваюць

гэтыя зажохлыя датыкненьні,
шурпатыя эпіфаніі,
цёмнае шчасьце

скамянелае сьвятло
безнадзейнае трываньне
самотная вера

* * *

*Алесю Разанаву — ліст*

Пакуль ты карміў гановэрскіх птушак
тут памірала эпоха.

Стагнала, курчылася, рассыпалася на шматкі
заўтрашніх газэтаў
аскепкі сноў, забытыя дробязі, бранзалеткі
ўспаміны герояў, а потым

памірала ціха і незаўважна, пакідаючы пасьля сябе
чыстыя вуліцы й гару трупаў на тэлеэкране
дзюркі нэкралёгаў, усталяваныя рэпутацыі
параграфы ў гісторыі літратуры.

Не, мы яшчэ не памерлі, шапталі героі
адзін аднаму ў даўгіх калідорах
халодных шэрых будынкаў
і хтосьці кранаў рукамі сьцены

а хтосьці нема крычаў на папялішчы
пра цёмныя часы аднаразовых чалавечкаў
часы хуткага спажываньня любові
хцівых ідовішчаў, часы блізкай сьмерці...

Пакуль ты карміў гановэрскіх птушак
тут памірала паэзія.

Зьбірала поўныя залі
інтэрвію ў лепшых газэтах
а потым клалася і памірала
проста так — ад шчасьця — ці ад агіды.

Алесю, няма як перадаць гэты ліст
туды, дзе ты сёньня. На мяжу сну і явы
да гановэрскіх птушак, на самы скрай сьвету
бо мы цені чужых сноў, Алесю, несьмяротныя цені

разам з Эўрыдыкай заблукалі сярод жывых
сьпяваем, плачам, дакранаемся да аблокаў
бо сьмерць немагчыма там, дзе не было нараджэньня
каму за гэта падзячыць — Плятону, Ісусу, Лао Цзы

я ня ведаю.

* * *

скажы тыя словы
таямнічаю моваю восеньскіх рыбаў

тое ж усё:
доўжыцца сон берагоў
ня ведае дна акіян

прывідная рука
пэндзлем правіць
шуму высахлых дзён
на сасьмяглых губах



* * *

Нерасчытаная сутра
Аднаго з патрыярхаў
Забытага веравызнаньня
Невядомае веры

Там усё запісана:

Пра пераходы
Ветру і цішы
Жыцьця і руінаў
Сну й чуйнаваньня

Пра вайну зь ліхтарамі
Пра чырвонае сонца
Пра ноч і дарогу

Пра сутарэньні
Затрыманага часу
На маршруце жаданьняў
У лябірынце пяшчоты
Дзе замест Мінатаўра
Кроплі марціні

Сутра
Незьлічоных кветкоў
З адмененых падарожжаў
У кішэнях
Начнога ветру

Тэлефонаў
Па якіх не шукаеш нікога
Запісаных, забытых
На рахунку кавярні

Сутра
Адкладзенага спадзеву
На пераўвасабленьне
У мёртвую котку

Сутра блуканьня

Для аднаго з патрыярхаў
Доўгачаканай самоты
У гатэльным пакоі
Дзе толькі сьцены і неба



# ЧАТЫРЫ ВЕРШЫ ВАН ВЭЮ

I

Дзікія гусі
Зьніклі за даляглядам

На халодным сьвітанку
Шэрань
Кранае золкімі пальцамі абляцелае лісьце

Вандроўнік
Дайшоў да самага скраю
Лета жаданьняў...

II

Калі восень
Нечакана прыходзіць у халодным сутоньні
Ахінае крыламі, астужае раскошай
У прысадах вецер
Гуляецца з мокрым лісьцем
І кроплі дажджу цалуюць выпадковыя твары
Тады ўсюды
Як подых, як прадчуваньне
Нябачна, невідочна, уяўна
Сышоўшыя з далёкіх вышыняў
Красуюць белыя кветкі

Лотацi, эдэльвайсы, хіба словы нешта значаць
Калі жыцьцё толькі сон і варта нарэшце прачнуцца
Разам зь імі
У краіне Чыстай Зямлі

Дзе душы, вольныя ад пераўвасабленьняў
Ад падарожжаў, ад прывязанасьцяў, ад пакутаў
Ад сьмерці
Уступаюць у чыстую дасканаласьць

Ах, прачнуцца б там, ды толькі восень
Занадта пяшчотна абсыпае лістотай
Замсьціць вочы
Шапоча пра вусьцішную радасьць каштанаў
Пра тое, што сьмерць — гэта сьвята

Восень
Шапоча простыя зьнікомыя словы
Аблокі плывуць, зьнікаюць у цішы неба
Як вечныя, празрыстыя, дасканалыя тайны
Каля якіх так імкнесься
Яшчэ крыху пабыць
Затрымацца

III

Раптоўныя хваляваньні неба, перуны, грымоты
Дождж змывае жаданьні, пакідае пустэчу
Ў якой адзінокі човен плыве супроць плыні
Гэта Шосты патрыярх разьбівае кайданы
Заблытанай кармы

Ягоны вялікі гнеў, вялікая міласьць
Палае ў Сусьветнай начы аж да золку
Раптоўныя сполахі, вогнішчы, зараніцы
Далёкае, халоднае сьвятло з Усходу

IV

За вокнамі вечар і слота
Дождж змагаецца зь ветрам
Я адзін у пакоі
І на маім стале

Парцалянавы кубак
З-пад выпітае гарбаты
Безнадзейна забыты
Дарэшты пусты й цудоўны

* * *

Чаму старадаўнія паэты
Не клапаціліся
Пра выратаваньне душаў?

Крыху віна, поўня, подых восені
І яны плачуць, як дзеці
Сузіраюць ружы ці хрызантэмы
Альбо глядзяць на мёртвыя целы
Што плывуць па Янцзы ў часы бескаралеўя
Чэрпаюць месяцовы адбітак
Не зважаюць на багоў і герояў
Бог, Імпэратар — аднолькава ў вышынях

І толькі іхныя душы
Як кірлі на пяшчаных плёсах
Імклівыя, незваротныя
Альбо як высокія сосны
Раскінутыя на паўсьвету
Альбо як клёны
Што скідаюць лістоту
Са шкадаваньнем

Ідучы гасьцінцамі, сьцежкамі
Самотныя, разам з усімі
Лёгкія, невыносныя
Заўсёды ў небясьпецы

Яны не шукаюць ключы
Ад незамкнутае брамы
Якой няма і ня будзе
Ў восеньскім парку



* * *

На паўдарозе жыцьця застыць у звар'яцелым спакоі
Слухаць: ад дотыкаў часу мякчэюць шэрыя сьцены
Ах ты, салодкі Дунай, — на губах — ды далёка да Троі
У залатой глыбіні сьпяваюць зьдзічэла Сірэны

Ветразі рвуць вышыню, пакідаючы мроі
Ў цёплых калысках — ды сьпеляць свабодаю вены
Ах вы, салодкія цені — ў вачох — з затанулае Троі:
Сьветлыя сны Эўрыдыкі, салодкія вусны Гэлены

# УГЛЯДАЮЧЫСЯ Ў ЮГЭН ПРАМІНУЛАГА ЧАСУ

Варушылі вуснамі, сплятталі рукі, маўчалі
Пакуль не патрапілі на самы скрай часу

Дзе ўсё, што мелася быць, — адбылося
Сонца сьвяціла, вецер заставаўся ветрам

Быў красавік — дзёрзкі, злы і халодны
Дрэвы стаялі, як быццам сьнілі кагосьці

І толькі яны — сыходзілі, адплывалі, зьнікалі
За смугой году, таялі альбо танулі

У прамінулым — што — так блізка — было
На выспах шчасьця, там, сярод акіяну

Засталіся: яго нататнікі, яе сны, каляндар
Два шалікі, зялёная лямпа, яе завушніцы

Шклянка гарбаты, узьлёт веяў, самота ў Cafe
І боль у сьпіне, крыху вышэй за сэрца

* * *

Жыцьцё апляло нас:
Пляцёны ўзор, павуціньне
Тонкае, рвецца...

* * *

*Лі Бо*

П'яны і далёкі, ён блукае па небе
Кідае маланкі, гуляе з аблокамі, запальвае ліхтары
Мудрасьці. Слухае галасы рыб
Сьпявае, танчыць, разьвінвае
Восені косы

П'яны і самотны, чакае сардэчнага сябра
Так, мусіць вярнуцца
Сюды, на неба, ня так проста дайсьці
Сьцежак амаль ня бачна
Прайшло столькі стагодзьдзяў

П'яны і сьветлы, ён прыходзіць у сны
Да забытых паэтаў, прамінулага часу
Штосьці абяцае, чамусьці вучыць — ня бойся
Заплюшчы вочы, ідзі на дно
Гэты боль — асалода

*Гэты боль — асалода*



* * *

Цыгарэтаў дым як туман
Вецер. Зноў гэты пакойчык
Тут ластаўкі жывуць

На досьвітку вылятаюць у сьвет
Вяртаюцца
Калі ўжо сонца за небакраем

Зьбіраюць каля аблокаў
Сны. Засьцілаюць імі
Чалавечыя гнёзды

Слухаюць
Адтуль, з вышыні
Галасы, літаньні

Ветлыя, імклівыя
недасяжныя

Крыху бліжэй да зямлі, ластаўкі
Крыху бліжэй, — варушу губамі

Ня так высока
Ня так пяшчотна
Ня так сьмела

А яны ня чуюць

Крэсьляць знакі ў паветры:
Цёплае трапятаньне
Лёгкіх крылаў сьляды

Часам самотныя
Часам шчасьлівыя
Часам незваротна забытыя

Там, у небе



# ВОСЕНЬСКІ ТАНЕЦ ДЭРВІША

Калі музыка згубы падступіць пад сон
Расплюшчацца вочы, узьнімуцца веі, прачнецца вецер
І птушкі пакінуць зарослыя болем аблокі
Тады пачынае свой восеньскі танец дэрвіш

Звонку падобны да скамянелага дрэва
На самым-самым скраі гэтага сьвету:
Старанна падбірае словы, гэсты, званочкі
Ідзе ў паветры — бо — не хапае сьцежак

На гэтай карціне, у гэтым часе, сьветлы Сымург
Корміць з рукі трыццаць самотных ценяў
Ды раптам на вуснах — лёгкай кісьлінкай — *haste naboshid*
Далёкім шэптам: тонкае — гэта сьвятое

На самым скраі: самоты, адчаю, сну
На самым-самым скраі: сярод аблокаў
Слодыч віна, смага, тонкія вусны
Танец апалай лістоты, Твой пацалунак

Час аддаваць: восень расчыніць вакно
Убачыш: сонца, мора, канец падарожжа
За даляглядам: пад ветразем сьветлы жагляр
Плыве па небе, — туды, дзе ўсё пачалося

---

Haste naboshid — напоўніся духам (недакл. пэрс.)

# II

## Прамінаць, лётаць, захутвацца ў аблокі

# СЭЙНЫ. КАРОТКАТЭРМІНОВАЯ НІРВАНА ДВУХ ДЭРВІШАЎ ПА ДАРОЗЕ НА ГАРУ ВУ-ДАНГ

*Андрэю Хадановічу*

Поўдзень. Халодны сьнег. Будысцкае лета.

Два дэрвішы імкнуцца ўзнавіць раўнавагу
ў Паўночнай Сарматыі, на мяжы яе
канчатковага зьнікненьня
*w obliczu przyszlości.*

Звоняць у званочкі
Сьпяваюць Харэ-Крышна
Ратуюць птушак.

Пасьпяхова ўдаюць ліцьвінаў
У бары «Жывец».

Мараць аб новай уніі
Каралеўства Дрэваў
і Вялікага Княства Аблокаў.

Блытаюць межы.
Зьнікаюць сярод пагоркаў...

Плывуць на Захад аблокі. Дрэвы
застаюцца дрэвамі.
Сны — снамі.

* * *

Сьвет завісае
бы кропля на зьдзіўленых веях
Тонкім і шэрым
Сэрца,
ільдзінкаю талай у душы халадзее
Ня ведае меры

Вочы заплюшчыць
ды жыць у салодкім палоне
Гэтай павуты
Толькі, аднойчы,
ізноў нарадзіцца ва ўлоньні
сьмешнай пакуты



* * *

Калі ноч — сьляпая вандроўніца
Сярод сьветлага дня прытуліцца
Вось дык радасьць — тым, хто ўмовіцца
Навакол зьбярэцца, расчуліцца

Як адкрые торбу дарожную
Як дастане рукой асьцярожнаю
Будзе воку аб што параніцца
Вось дык радаць тым, хто застанецца

Ды калі, угледзеўшых, досьвіткам
Павязуць, дарогай укатаных
Ціхіх зорак срэбныя россыпы
У вачох запаляцца матавых

* * *

Разгорнуцца забытыя старонкі
Навокал — пазалота і камэі
Асыплюцца шурпатых літар гронкі
І словы, быццам зьдзіўленыя фэі

Пачнуць плясьці няўлоўную павуту
Як з кветак пчолы — мяккую атруту

Сплятаць ў адно: каштаны, шэпты, слоту
На вуліцы сьняжынкі, пазалоту

Гісторыю — у сто старых санэтаў —
І музыку, і Гёльдэрліна стрэлы
Лясныя сьцежкі непрытомных мэтаў
І лапік неба — белы, белы, белы

* * *

Сьнег кружыцца за вакном
Падае, занепадае
На халоднае зямлі
Ў белай скрусе прападае

Вее, сьцелецца, зьвініць
Б’е бубенчыкамі шалу
На халоднае зямлі
Танчыць сьнежную Вальгалу

Засыпае спакваля
Вочы, весьніцы, парканы
На халоднае зямлі
Сее сьнежныя дзірваны…

Сьніць салодка: ля вакна
Веі, сьнег, шчыпотка солі
Белы сон у белым полі:
*Тонкіх пальцаў белізна*

* * *

Зыначваюцца крокі:
Лякарні, душы, брамы.
Таемныя выркі,
Расквечаныя крамы.

Пустыя калідоры —
Адчужана прастора.
Бальсанавыя норы
Вялебнага сабора.

Нязбыўна, назаўсёды,
Адчайна, гожа, шэра:

Самотных вулак лёды
І цішыня, і вера.



* * *

за даляглядам начы
гострым як полымя
спакойным як лёт стралы
выбіраем імёны:

сьмерць — забытая казка

* * *

Сьмерць — сяброўка, забытая казка
Пакідае мяне назаўсёды

Пакідае мяне на самоце
Несьмяротнасьці — нібы ў пустэчы

Ў незваротнасьці руху паветра

У якім распускаюцца кветкі
Крохкай вечнасьці, п’янай ад болю



* * *

Восень у Парыжы:

Вецер гартае старонкі сноў
Сена цячэ праз пальцы ў нябыт

Такая спакуса
Падысьці да самага скраю
Левага берага

Дзе жоўтыя дзьмухаўцы
Вечар
Залатое шчасьце

* * *

прыпынак
сьвятло

ФАНТАСТЫЧНЫЯ
далёка-далёкія сны
кнігі і людзі

ТАМ ТАМ

краіна эўропа
дзіўныя кветкі твае

*на падвоканьні*

# ВІЛЬНЯ

Сьнег за празрыстым шклом. Японскі пэйзаж.
Вечар. Зімовы сон сярод талай вады.
Сьнег за халодным шклом. Спаміж восеньскіх краж
Сэрца — часовы прытулак — такое бяды

Сэрца — халодны прытулак — восеньскі госьць
Прыйдзе зімовым гасьцінцам змарожаных вен
Прыйме ад тога, што згублена — тое, што ёсьць
Ў Вільні — далёкай халоднай красою — югэн.

* * *

*Ахвяруецца Т.С.*

*Восень, сястра*, сярод твараў, што бачу наўкола
Мне не хапае чагосьці, магчыма таго

Што ў лістападавым шале ты тайна хаваеш
Сярод бясконцых дажджоў і пажухлай лістоты

Сярод самотных шпацыраў у прыціхлых завулках
Сярод нязьменных прытулкаў і палкіх жаданьняў

# ПРАЗРЫСТАСЬЦЬ

Калі за халодным сутоньнем зімовага сну
Зьяўляюцца хвалі і вечар хавае разрывы
Празрыстасьць паўстане, у шэптах далёкай крыві
Імкненьне за скрай пераможа прытулак вірлівы

Які так трымае. На самы апошні рубеж
Усё адыходзіць. Да самай адчайнае меры
Туды, дзе празрыстасьць — ў прадоньне — сягае душа
Ды ў стомленым сэрцы, як помста, прачнуцца Хімэры

* * *

Сьвет, раптам асірацелы
Доўжыцца, пераходзіць
У гэты боль невыносны
У гэту пякучую слодыч+++

Працінае навылет
Працінае дарэшты
Празрынае, вярэдзіць

Недзе там, незваротна
Абуджаецца слова

# ЛЁНДАН

Спалатнелыя вусны пустыя карункі плялі
І ў бяздомнае неба забытаю музыкай плылі
Словы здраджвалі, пелі — сьляпыя натоўпы ішлі
І самотнае сонца згасала каля Пікадылі

І імя, нібы птушка, ляцела, зьлятала з рукі
Піла неба нэктар, акуналася ў цёмныя воды
Памірала — ўскрасала наноў, гадавала расткі
Немагчымай любові, ды мовіў Харон — назаўсёды

Эўрыдыка прачнецца і вернецца ў сьветлую ноч
І Арфэй, звар’яцелы і шчасны — ўпадзе на калені
Ў доўгім сьне, мройным садзе шалёнай пяшчоты,— наўзбоч
Ад якога ўсё штосьці чакаюць памерлыя цені.

# ВАКНО

Надзейны прытулак
далёкай і зрэбнай начы

(а можа жыцьцё, што так прамінае
праходзіць шукае напраўдзе
а гэтай гадзіне)

Адбітак празрысты
Асьветлены
даўна памерлы



* * *

Калі восені рудыя косы
Разьвінаюць і музыка грае
Уначы абуджаецца сэрца
Сьмерць-катрынка тужліва сьпявае

Варажбітка, сьляпая марока
Пакідае нязводныя плямы
Вецер лісьце апалае гоніць
Да зімовай, далёкае брамы

Й незагойна, у восеньскім шале
Ўсё кранае нацятыя струны:
Ці то ластавак стромкія вежы
Ці халодныя, цёмныя руны

* * *

Ўсё той жа сон:
нас зноўку прагне сьмерць
так матылёк імкнецца да сьвятла

Прысутнасьці адпрэчаны пагляд
Блукае сярод водараў тугі
Прысутнасьці, што некалі была

Шалёнай смагай. А цяпер, здалёк
Заве ахрыплым голасам цыкад
Трызьненьнем, што шукае берагі

* * *

Поўдзень. Сьляпучы змрок
Не працягнуць рукі
З жахам, ня ўбачыць твар
У люстэрку ракі

Там, дзе аер, трысьнёг
Морак пустых вачніц
Ды непрытомны бёг
Самазьнішчальных сьпіц

* * *

Ноч, быццам кубак здрады
Плешчыцца, па-за шчасьцем
Дзе вы, старыя звады
Сьмерць, вараное масьці

Цешыцца, прамінае
Курчыцца, б’е ў ядвабы
Мройная, апранае
Ў сон спалатнелы, слабы

Як самота ліцьвіна
Што няма дзе прыкласьці
Каля горкага тыну
Конь, шалёнае масьці

# 33

Адзін у халодным пакоі, я гляджу на партрэт
Намаляваны у іншым часе, з чужога сну
Распазнаецца толькі пах благіх цыгарэт
Ды забытая песьня. Яе адну

Кружэлка, 33 абароты, грае Уліс
Так далёка-далёка, нібы над зямлёй
Я ня ведаю словаў, напэўна блюз
У халодным пакоі, гэтай парой

Нешта пра чужаніцу сьпявае *Уліс*
Пра тое, што Імпэрыя мінае як дым
У халодным пакоі пах цыгарэт
Вось мы і дома, каханая, па-над зямлёй

Я ня ведаю словаў, кроплі дажджу
Падаюць на падлогу, у цішыні
Перадапошні тралейбус, за вакном
Праплывае павольна, у вышыні

Па-над зямлёю, каханая, па-над зямлёй

* * *

Датыкненьні тонкіх губ
Сьлед крыху прыпухлых вуснаў
Ад начнога недасыпу
Ці банальнае самоты

Ад нерасказанай казкі
У прыцішаным паўзмроку
Вылучэньне доўгіх веяў
Для асобнай партытуры

Дотык дрыгаткіх далоняў
Высьпяваньне мяккіх рухаў
Ў некантраляваным шале
Крыху звар'яцелых нотаў...

Наш маленечкі аркестрык
Граў для нас начное скерца
Мы былі ў ім слухачамі +++
Нотамі і скрыпачамі



* * *

Заблытацца, забыцца, загубіцца
Ня памятаць імёны і адрэсы

І толькі ў выпадковым цягніку
На выпадковай станцыі, уночы

Прыгадваць разбэшчаныя вусны
Ды цалаваць распешчаныя вочы

* * *

Такая спакуса — блытаць словы, рытмы, адзеньне
Трымаць цябе за руку, чытаць кнігі па алхіміі
І казаць самому сабе: яна — мая музыка

Часам далёкая, а раптам гэтыя вусны
А рукі — не зразумееш — плач, ці проста па клявішах
Кроплі дажджу пішуць лісты закаханым

Так, начныя лісты — гэта подых шчасьця
Подых, альбо ўздых, альбо падарожжа
Да скраю самоты, бо толькі там пацалункі

Джаляць, і забіваюць, і п’юць імгненьне



* * *

Вецер
На гэтых пагорках
Толькі яму дазваляю
Абвяваць тваё цела
Дакранацца да вуснаў
Мкнуць удалеч

* * *

Па-за вокнамі дождж пляце павуціньне сну
*Ў маім сэрцы дажджы* як у гэты бясконцы дзень
І холад тваіх рук, і морак тваіх губ
У паўзмроку тваіх вачэй блукае мой цень



* * *

Звар’яцелая восень:
Сьнег, віно, пацалункі

І гэтыя словы, якія
Паўтараеш як мантру
Сонечна і салодка:

*Я ў цябе закахаўся.*

* * *

Мела ўладу загадваць —
Апынулася ў палоне

Хацела ляцець удалечыню
А засталася так блізка

Верыла, вагалася, нерухомела
Спляталася ў жарсьці і асалодзе

Мілая госьця, пяшчотная паланяначка
Твая рука — у маёй



* * *

Твае салодкія вусны — толькі для звар'яцелых
Толькі для закаханых, гатовых ісьці на дно

Жарсьці — толькі для мілых тапельцаў
Згодных разьбіць галовы — аб мужнасьць і аб пяшчоту

Аб немагчымасьць каханьня — на гэтых мяккіх аблоках

* * *

Як птушку
Карміў цябе з рукі
Не ўлятай, каханая!



* * *

Тваё салодкае ўлоньне пахне ліпай і мёдам
Яно — сакрэтны пакой, у крэпасьці без абаронцаў

Дзе замест сьценаў — дзёрзкія смочкі грудзёў
Лётаюць нібы ластаўкі, разьліваючы слодыч

Дзе толькі мілыя госьці блукаюць па калідорах
Сярод сплеценых целаў, у замкнёнай прасторы

Даўна п’яныя — ад словаў і ад пацалункаў

* * *

Твае вочы — два мяккія дыяманты
Што зазьзялі раптоўна на сьветлым небе

Два раскрытыя вокны — у восень і ў пяшчоту
Два птушаняткі — што лётаюць на прывольлі

Ды зьбіраюць з вуснаў цёплыя пацалункі



* * *

Дождж, маланкі, але
Маеш заўсёды прытулак
У маім сэрцы

* * *

Тваіх валос цёмныя вадаспады
Патраплялі на вусны, танчылі, спакушалі

Апляталі цела, раўнавалі пяшчотна
Да незнаёмых веяў і да дзёрзкіх мужчынаў

Заміналі нам цалавацца



* * *

Вера паэтаў, птушкай сьляпою сядае на рукі

Ведае: вочы заплюшчу й буду
мроіць аб дрэве самотным, маўклівым

Ведае: буду сыходзіць пакутна
ў пекла, дзе гукі жалейкі сэрца ўначы разьдзіраюць

Ведае, словы складуцца й поўня
залямантуе, заплача: ўспаміны пра неба

Вучыць: самотныя зоркі мусяць гарэць безразважна
й падаць бясконца

Вера паэтаў, каханьне

# III

## Мейсцы паэзіі

* * *

Паэзія ў грамадзтвах нашага тыпу канчаткова пераўтварылася ў дзіўны эзатэрычны занятак, якім займаюцца *насуперак часу*.

І ня проста таму, што ў сёньняшнім часе *няма мейсца* для вялікага паэта.

Ня толькі таму, што гэты час вымагае хутчэй бадзёрага плёсканьня на паверхні словаў, чым экстатычнай ўзьнёсласьці альбо містычнага заглыбленьня, — таго, што стагодзьдзямі складала *сутнасьць паэзіі*.

Сёньняшнія культуры навучыліся імітаваць усё, што заўгодна, і пераканаць публіку (альбо большасьць) у тым, што *вялікі паэт перад вамі* ня так ужо і складана.

Але тое, што сталася такім лёгкім, тое, што ўжо не патрабуе *кону* і *ахвяры*, а вымагае толькі тэхнікі, — гэта ўсё ўжо *ня мусіць* называцца паэзіяй.

* * *

Магчыма, мы ўступілі ў эпоху, якая ўжо ня мае патрэбы ў паэзіі, але й ня мае адвагі, каб канчаткова ад яе адмовіцца.

Час хіжых відовішчаў. Вянозных натоўпаў. Хуткага спажываньня словаў.

У такі час паэты прападаюць, зьнікаюць, апранаюць маскі, пачынаюць гуляцца ў хованкі — з часам і ягонымі сучасьнікамі.

* * *

Складаючы *каталёгі хованак*: гульні ў пустаце, сумнае і пяшчотнае штукарства, уцёкі ў Афрыку, самагубства, пошукі мудрасьці, угляданьне ў *югэн* яе вуснаў...

* * *

Паэзія:

Мейсца, дзе з намі *здараецца мова*.

Па-іншаму: мейсца, дзе *мова ёсьць*.

Ня *тая* мова, раскладзеная на палічкі лёгікі і граматыкі, вывучаная і прыручаная, рассыпаная па слоўніках.

Іншая мова, усёабдымная і ўсёмагутная.

Мова, якая праплывае праз нас, як аблокі, пяшчотна ахутвае рэчы, прыхінае да сябе прастору, час, чалавека.

Дорыць нам сьвет, душыць нас *у ягоных абоймах* — але й адначасова вызваляе, ратуе.

* * *

Паэзія:

Мейсца канцэнтрацыі й узвышэньня духу.

Узгонка, алхімія.

Мейсца, дзе з *руды словаў* паўстае *золата верша*.

* * *

Паэзія:

Растрата, выбух.

Жменька словаў, рассыпаных і сабраных наноў.

Мілы і непатрэбны дарунак.

Ахвяра.

* * *

Можа быць, тое, што мы называем імёнамі паэтаў, зь іншае пэрспэктывы бачыцца ўсяго толькі як *магчымасьці мовы*, яе аддзелы, яе краявіды.

Гэты ўзгорак — Рыльке, гэтае возера — Мандэльштам, вузкі каньён — Паўнд, сьцежка ў дзікім лесе — Юхнавец.

І вядома, вясёлая карчма пры дарозе — Лі Бо.

Гэта ён спрабаваў зачарпнуць адбітак месяца ў возеры. П’яны і сьветлы, ён перакуліў човен і патануў.

Патануў у небе. Больш дакладна — у адбітку неба.

* * *

Паэзія:

Паляваньне на словы.

Танец.

Асалода ад прамаўленьня.

Шаманства.

* * *

Паэзія:

Спроба ацаліць мову.
Вызваліць мову — ад чалавека.
*Даць мове шанец.*

* * *

Выйсьці ў прастору, дзе ўжо *толькі мова гаворыць*.
Альбо: патрапіць *па той бок мовы*.

* * *

Паэзія:

Згубіцца, патануць, пайсьці на дно мовы.
Заплюшчыць вочы, каб пачаць бачыць — усярэдзіну, *у глыбіню слова*.

* * *

Час праходзіць, прамінае, праплывае праз нас — *незваротна*.
У часе анічога няма — апроч гэтае незваротнасьці.
У часе анічога *ня мае мейсца*, ня ў стане затрымацца.
Час пасыпае *ўсё* белым пылам — забыцьця, нямоты.

Што застаецца?
*Дзе, калі, на беразе якой ракі* я буду ўзгадваць гэтыя словы?



* * *

Застаюцца *мейсцы паэзіі*.

Застаюцца матылькі словаў, што прысьніліся калісьці даўно аднаму вельмі старому кітайцу і цяпер порхаюць са сну ў сон, ад эпохі да эпохі.
Адважыцца, пайсьці на дно часу, патрапіць у гэтае мейсца, у гэты сон — і вось ты ўжо ідзеш па дарозе, і матылькі словаў сядаюць табе на веі, дакранаюцца — да душы, да вуснаў.
Бязважка, бязьлітасна — і пяшчотна.

Тут, сярод аблокаў.

# IV

## Жыцьцё словаў: *эпіфаніі*

## Ластаўкі

—Людзі так апантана імкнуцца стаць кімсьці, — прашаптаў Алівэйра. — І ў некаторых гэта нават атрымоўваецца.

—Таму я так люблю ластавак, — сказала Мага.

## Сон анёлаў

Магчыма, праз жыцьцё трэба праплываць лёгка, нібы праз сон.

Не нагружаць яго суворай і цяжкой сур'ёзнасьцю.

Не чакаць ад яго *сэнсу*.

Сьніць яго, як быццам бы гэта быў *сон анёлаў*.

## Літара В

Вочы, ветразі, веі
Вартыя вечных вяртаньняў...

## Мысьленьне

Мысьленьне — скальпэль, які расьцінае закарэлую халодную паверхню сьвету.

Паэзія — наркотык, які дазваляе забыцца і ня бачыць яго крывавую кульцю.

# Катакомбы

Катакомбы... у небе, сярод аблокаў — чаму б і не?

*Нябачныя штольні, у якіх здабываюцца бязважкія скарбы.*

# Люстэркі

Мы ў люстраным пакоі, у якім розум бачыць бясконцую гульню сваіх уласных адбіткаў. Ілюзорнасьць выявы тысячакроць памнажаецца на непрытомнасьць камэнтару.

У сьвеце няма анічога, што можна было б назваць *рэальным*.

Зазірнуць па той бок люстэрка *немагчыма*, не разьбіўшы люстэрка.

Зазірнуць па той бок люстэрка ўвогуле *немажліва*.

Там можна толькі *апынуцца*.

# Героі

Калісьці Францішак распавёў яму дзіўную гісторыю.

Пра штурм крэпасьці, за сьценамі якой — невядомыя абаронцы. Штурм доўжыцца многа месяцаў, можа, нават гады. Калі тыя, хто штурмавалі, нарэшце ўзыходзяць на сьцены, яны з жахам бачаць саміх сябе — забітых, раскіданых паўсюль у дзіўных позах, з агідай і зьдзіўленьнем на тварах.

І тут прыходзіць разуменьне, што яны зусім ня тыя, за каго сябе прымалі, кім сябе лічылі. Што сапраўдныя героі — яны — загінулі.

І тады яны даюць загад зьнішчыць усе люстэркі ў Каралеўстве.



# Радзіма

Мая радзіма — мова, я застануся ў мове, разам са словамі, паміж імі, інтанацыяй альбо яе збоем, *магчымасьцю слова*. Толькі тут я адчуваю сябе дома, знаходжу сябе й губляю, паміраю й нараджаюся, разумею, кім я ёсьць, — прыгадваючы свае вяршыні й свае прадоньні.

Прыгадваю па тых знаках, што засталіся (бо немагчыма вечна ўзносіцца альбо вечна падаць)...

# Тэатар сьвету

Што мы тут робім? — запісаў Францішак. — Гэта асноўнае пытаньне. Мы прыйшлі ў сьвет і мусім граць на сцэне, у тэатры.

Каталёг роляў — безумоўна, гэта важна.

Граць усё гэта дасканала, самазахоплена, без спадзяваньня на вынік (дзякуй, Патанджалі!) — вельмі істотна.

Выбар п’есы — крыху не па адрасе, але ўсё ж такі, на гэта можна паўплываць — малітвамі, мантрамі, дабрачынным жыцьцём. Альбо наадварот — лайдацтвам, геніяльнымі вершамі, беспрабудным п’янствам.

І ўсё ж такі — навошта?

# У другі бок

Гісторыя пра чалавека, які ішоў у адваротным накірунку.

Гісторыя пра раптоўную — мэтафізычную — страту прытомнасьці. Чалавек ходзіць, размаўляе, працуе і раптам — штосьці здараецца. Ён адчувае сябе неўгрунтаваным. Каб зразумець, *што і чаму*, ён пачынае займацца літаратурай. Піша пра ўсё гэта. Становіцца вядомым, нават славутым.

Час ідзе.

З узростам усё менш пэўнасьці, усё больш зьдзіўленьня. Але грамадзтва, наадварот, кананізуе ўсе ягоныя неадпаведнасьці: ягоны боль, няпэўнасьць, няведу.

А ён марыць аддацца сьвету. Зацiхнуць у ягоных абдымках. Хадзіць зранку на працу, ня думаць ні пра што, адно чакаць, чым усё скончыцца.

Пражыць сваё жыцьцё ціха і незаўважна.

Назаўсёды зьнікнуць — сярод бытнага.

Сярод кветак і сноў.

## Тры гісторыі пра ідэнтычнасьць

Што такое *маё Я* — я ня ведаю. Але той *вобраз мяне*, за прысутнасьцю якога ў культуры я бы назіраў з асалодай, — гэта крыху звар’яцелы будыст з глыбокай цікавасьцю да Лі Бо, Чарана, Гайдэгера ды Тавяньскага. Адразу папярэджваю — за гэтым вобразам, які сабраны з розных фрагмэнтаў, не знаходзіцца аніякай ідэнтычнасьці. Таму тры магчымыя гісторыі пра яе — гэта тры гісторыі пра яе адсутнасьць.

## Эдып у паўзмроку

Мы брыдзем па жыцьці навобмацак, як у лябірынце (альбо пячоры), бачым усяго ў некалькіх мэтрах перад сабой.

Форму нашаму жыцьцю часьцей за ўсё надаюць зьнешнія абставіны — сьцены. Абмацваючы сьцены, мы знаходзім выйсьце альбо праход...

Эдып у паўзмроку: ані сьляпучага сьвятла, ані суцяшальнае цемры — толькі цені, цені і цені ценяў.

## Спосабы зьнікненьня

Пагаджацца на тыя формы публічнай прысутнасьці, якія прапаноўвае эпоха, альбо ціха зьнікаць за смугой часу, застаючыся ў цішы паўісnаваньня, супадаючы толькі са сваім жыцьцём, не давяраючы ягоныя таямніцы ані слову, ані выяве.

У тым, каб прапасьці, не застацца, ёсьць свая асалода.

*Шчасьце ня быць.*

## Праз...

Прайсьці празь сьвет у дзіўнай захопленасьці альбо захопленым зьдзіўленьні. Ісьці празь сьвет формаў, разумеючы, што сярод іх немагчыма затрымацца.

Выйсьці па той бок сьвету.

Зайсьці *там* у кавярню, замовіць кубачак кавы.

## Літаратура як спакуса

Літаратары дзеляцца на тых, хто *пакідае сьведчаньні*, і тых, хто *будуе лябірынты*, нібы спадзеючыся ў іх застацца, ці хаця б затрымаць выпадковых наведвальнікаў.

Ёсьць тыя, хто спакушае, і тыя, хто спакушаны.

Ёсьць тыя, хто пражывае іншыя жыцьці разам са сваімі пэрсанажамі, і тыя, хто імкнецца пакінуць самога сябе на старонках.

Яшчэ ёсьць тыя (іх заўсёды абсалютная меншыня), хто піша, проста каб зразумець сваё жыцьцё.

Іх чамусьці шкада найбольш.

## Мудрыя

Які сьвет, такія і героі. Было б дзіўна, калі б мудрыя засядалі ў рэдакцыях альбо радасна глядзелі на нас з тэлеэкрана. Сядзяць яны сабе ціхенька ў *ашрамах*. Альбо зусім ня ціхенька. І зусім не ў ашрамах. П’юць каньяк. Думаюць, як адсюль выбірацца.

І што самае цікавае, куды выбірацца. І навошта.

Сапраўды, навошта? Калі й так насамрэч нічога няма, а тое, што мы бачым — толькі бурбалкі на паверхні, ці не прасьцей супасьці, распусьціцца, забыцца на сябе?

## Ніхто

Стаць нікім — значыць стаць дэміюргам, стаць сваёй уласнай магчымасьцю.

Бо немагчыма стаць тым, кім ты ўжо ёсьць.

## Што гэта было?

Шапэнгаўэр назваў гэта воляй. Ніцшэ — магутай. Бэргсон — жыцьцёвым парывам.

*Хто і куды імкнецца?*

Ці больш дакладна — хто і куды *ў нас* імкнецца?

## Майстра

Майстра становіцца майстрам не таму, што ён ведае і разумее больш за іншых, а таму, што ён ведае і адчувае *сваю форму*, форму як сваё абмежаваньне, як *свой скрай*.

Вучань можа *і так і гэтак*. Майстра можа *толькі так*.

## Неба

У нас зь Міцкевічам ня толькі агульная зямля, але — і гэта больш істотна — агульнае неба.



## Крытыка ў-меру-звар'яцелага розуму

Знайсьці мейсца, дзе розум, сутыкаючыся з тым, што ня можа быць падумана адназначна, пачынае ціха вар'яцець, блытаць прычыны і наступствы, рыфмаваць паняткі, сьпяваць і танчыць у дыянісійскім экстазе (гэтаму яго спрабаваў вучыць Ніцшэ, да таго як сам звар'яцеў канчаткова) .

Зрэшты, *вар'яцець канчаткова* ня варта. Лепей — *да пэўнай мяжы*. У меру.

Мера мусіць быць абавязкова, бо менавіта мера, рытм, музыка — тое, што дазваляе хаосу прымаць форму паэзіі.

## Прагрэс

Слова «прагрэс» выклікала ў Клакоцкага гістэрычны сьмех.

## Ляйбніц, Бог і Акудовіч

Ляйбніц сьцьвердзіў, што Бог не зьяўляецца ані пазытыўнай, ані нэгатыўнай велічынёй. І таму мейсца Бога на лічбавай шкале — абсалютны Нуль.

Потым гэтую думку адкрыў як сваю Валянцін Акудовіч.

Магчыма, пытаньне — чыя думка — некарэктнае, і наадварот, гэта яна, думка, адкрыла для сябе Ляйбніца, Акудовіча... тысячы іншых.

Магчыма, гэта яны, думкі, нас думаюць, яны выбіраюць пэўных людзей як інструмэнт, прыладу.

Думаюць — сябе і сьвет — зь іх дапамогай.

## Веда

Чым менш пра цябе ведаюць, тым лепш.

## Эйдасы

Магчыма, ня ўсё сёньня так проста на Плятонавых нябёсах.

Штосьці адбылося з эйдасамі. Ці, больш дакладна, з агульнымі ідэямі.

Сёньня гэтыя ідэі ўжо ня мілыя ліхтарыкі, што сьвецяцца ведай, як у часы Плятона, — а хіжыя і падступныя стварэньні, якія толькі й чакаюць моманту, каб угрызьціся ў нашую сьвядомасьць, і потым не адпускаць...

Самы час распачынаць адваротнае падарожжа — назад, у пячору. Туды, дзе цені. Дзе ўтульна. Дзе гаючы паўзмрок.

Зрэшты, самыя мудрыя — як Чжуан Цзы — ніколі зь яе й не выходзілі.

## Маскі

Сон: картачная гульня, у якой *на кон пастаўлена Быцьцё*.

Кім маглі б быць гульцы, удзельнікі? Якога ўзроўню бытнага? Чараўнікі? Богі? Звар’яцелыя Анёлы?

Ці магчыма пытаньне мусіла б гучаць інакш:

За якімі маскамі ім лягчэй было б схавацца?

## Недавер

Недавер да сьвету, які цябе няспынна падманвае, ловіць у сеткі, імкнецца завалодаць, пасадзіць на ланцуг — жаданьняў, наяўнага быцьця, — а потым забывае, пакідае як зламаную ляльку на сьметніцы часу.

І няма каму паскардзіцца, і няма як пазьбегнуць...

## Чытачы

Нават адзін чытач — гэта замнога.

## З размовы:

— Чаму ты пішаш?

— Бо інакш мне прыйшлося б сядзець і чакаць сьмерці.

— Ці праўда, што ў паэзіі цэняцца толькі радочкі, напісаныя крывёю?

— Так, крывёю, — але на аблоках.

## Ён

Яго згулялі ў арлянку:
Падзялілі на сьвятло і цень
Матылькі словаў сядалі яму на веі
У цёплы, сонечны дзень...